Рэспубліканскі конкурс сачыненняў

# “Мая Раздіма - Беларусь”

Холадаў Кірыл Аляксандравіч
6 клас,
ДУА “Вялікаліпаўская базавая школа”
Магілёўская вобласць, Хоцімскі р/н, аг.Ліпаўка, в.Навасёлаў, 16

З зямлёй і небам звязвае мяне ніць –
Неразарваная векавечна павуціна:
Зямля мяне галубіць, як вернага сына,
А сонца мне душу не кідае туліць..
Я. Купала

“Мой родны кут, як ты мне мілы..”, гэтыя словы знакамітага паэта найбольш яскрава сведчаць пра маю любоў да роднага краю, куточка, дзе праходзіць дзяцінства, юнацтва, гэта месца, адкуль пачынаюцца дарогі ў дарослае жыццё. Для мяне малая радзіма – гэта вёска Ліпаўка. Ліпаўкай яна завецца таму, што тут абапал вуліц растуць магутныя шматгадовыя ліпы. Мядовы іх пах разносіцца па вёсцы, калі яны цвітуць. Працавітыя пчолкі гудуць, снуюць сярод ліпавага цвету. Гул стаіць такі навокал ад гэтага рою пчол, што нельга не заслухацца.

Амаль каля кожнай хаты размясціліся буслы, якія прылятаюць да нас штогод. Перш прылятае бусел. Ён майструе гняздо. Затым прылятае яго сяброўка. Буслы, як людзі, клапоцяцца адзін пра аднаго. А якая прыгажосць, калі ў гняздзе з’яўляюцца маладыя бусляняты. А бацька-бусел кружыць над вёскай, распрастаўшы вялікія крылы. Мір і спакой у нашай вёсцы, калі буслы жывуць сярод людзей.

Мая вёска Ліпаўка - самы крайні на ўсходзе Беларусі населены пункт ля мяжы з брацкай Расіяй.

Прайшло восемдзесят год, як апошні фашысцкі салдат ступаў па зямлі першага вызваленага на ўсходзе Беларусі раёна. Але памяць чалавечая жыве, як і жывуць неўміручыя подзвігі сыноў і дачок нашай Радзімы. Пражытыя гады цяжкага перыяду ваеннага ліхалецця і раны, нанесеныя фашысцкай акупацыяй у гады вайны, застануцца назаўсёды ў нашай памяці. Яны павінны застацца, каб гэты жах не паўтарыўся.

За адзінаццаць кіламетраў ад цэнтра маёй вёскі, амаль на мяжы з Расіяй, некалі была вёска Вітава, каля якой срэбрам бруіла невялікая рэчка з такой жа назвай. У гісторыі не захавалася паходжання гэтай назвы, але адна з легенд гаворыць, што тут у далёкія часіны Вялікага княства Літоўскага стаяў Вітаўтаў заслон, а пасля яго падзення паселіўшча пачало звацца Вітаўняй, пазней – Вітавай. Невялікая вёсачка, усяго 18 хат. У наёмным памяшканні працавала школа, гучалі, адклікаючыся рэхам у сасновым бары, звонкія дзіцячыя галасы. Але чорным смерчам уварвалася вайна ў мірнае жыццё Вітавы…

Не скарыліся ворагу жыхары Вітавы. Рызыкуючы сваім жыццём, і жыццём сваіх блізкіх, дапамагалі партызанам. Цяжкае выпрабаванне лёсу выпала на долю вітаўцаў. 23 мая 1943 карнікі спалілі вёску. Вайна разлучыла жыхароў Вітавы, раскідала іх гняздо.

У гонар 30-годдзя Вялікай Перамогі на руінах Вітавы быў устаноўлены помнік у выглядзе печы, як сімвал смутку па ўсім страчаным.

Я лічу, што памяць – аснова ўсяго існавання. Памяць – боль чалавечай душы. Той, хто абаронцаў сваіх забывае, не будзе шчаслівым ніколі ў жыцці.

На тэрыторыі нашага сельскага Савета зараз знаходзяцца: помнік ў гонар вызвалення вёсак Вялікая і Малая Ліпаўка ад нямецка-фашысцскіх акупантаў воінамі і танкістамі 233-га палка 50-ай арміі Бранскага фронту; помнік на ушанаванне памяці 212 землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, дзве брацкія магілы, дзе пахаваны безымянныя байцы і лётчыкі. А таксама брацкая магіла, дзе пахаваны два савецкія воіны Багамолаў А. Г. і Падкупка І.Н. Іх імёны выбіты на пастаменце. Мы, разам з другімі школьнікамі прыбіраем, фарбуем гэтыя помнікі, па святах прыносім кветкі. Я згодзен з тым, што народ, які забывае сваё мінулае, не мае будучага.

Якая ж мая вёска зараз?

Паабапал вясковых вуліц прасторныя, прыгожыя будынкі, адзін за другі лепшы. Нельга не залюбавацца творчасцю “майстроў-сталяроў”, іх багатай фантазіяй ў аздабленні свайго жылля.

Імкненне да прыгажосці ўласціва амаль кожнаму чалавеку. У любой рабоце чалавек заўсёды імкнецца, каб вынікі яго працы былі не толькі карыснымі, але і прыгожымі. Жыве і развіваецца ў нашай вёсцы мастацтва прастога народа. Яго рукі ствараюць неабходныя ў жыцці рэчы, пякуць хлеб, з яго вуснаў гучаць родныя сэрцу мелодыі, і ўсё гэта яны спалучаюць з асноўным заняткам – земляробствам.

Кожны павінен любіць свой край. Бо чалавек, які любіць зямлю, на якой нарадзіўся, і, якая ласкава называе яго сваім сынам, паважае свой край, які ўзгадаваў яго, робіцца моцны і мудры – ён не зможа тады пагадліва ставіцца да іншых краёў, іншых земляў.

Выхаванне сваім краем, выхаванне роднаю зямлёю, выхаванне дарагімі краявідамі, выхаванне традыцыямі і добрымі (працоўнымі і ратнымі) справамі продкаў – гэта самае важнае.

Родны кут - самае мілае, прыгожае месца на зямлі. Тут самая прыгожая прырода, самыя цікавыя казкі, самыя прыгожыя і добрыя людзі. Тут усё сваё, такое роднае і каханае.

У кожнага чалавека ёсць свой родны кут, куды хочацца вярнуцца. Чаму гэта месца так цягне да сябе? Чаму многія тужаць аб ім на чужбіне? Напэўна, таму, што знаёмства з навакольным светам ўпершыню адбывалася менавіта ў гэтых краях. Тут я маленькім упершыню убачыў сонца, пачуў шум дажджу, пайшоў у школу, здабыў сяброў.

Родны кут - гэта месца, дзе жывуць самыя добрыя людзі. А колькі ўсяго цікавага тут было, колькі добрых успамінаў звязана з гэтым месцам. Тут родны дом, дзе мама чакае са школы. Прыходзіш дадому, а на стале блінцы з малаком, смажаніна з цыбуляй. Што можа быць смачней?

Куды б не закінуў чалавека лёс, дзе б ён не быў, у які куток зямлі ён бы не зайшоў, ён заўсёды будзе ўспамінаць свой родны кут, такі прыгожы і каханы.